"Хлебозавод №1 г. Минска" выставляется на торги с начальной ценой 125.600 млн бел. рублей. Объем обязательств предприятия, которые необходимо погасить, — 4182 млн бел. рублей. Среди условий покупки — вложение в течение трех лет не менее 13 млн долларов в застройку площадки по ул.Раковской, 23б, 25, 30 и ул.Витебской, 17 в рамках развития исторического центра Минска.

Начальная цена продажи предприятия "Чижовский рынок" установлена в размере 8832 млн бел. рублей. Сумма обязательств предприятия составляет 598 млн бел. рублей. Инвестор должен сохранить трудовой коллектив — 46 человек. Также покупателю необходимо обеспечить поэтапное строительство многофункционального комплекса по проезду Ташкентскому, 5.

Договоры купли-продажи заключаются с победителями конкурсов в течение 20 календарных дней.

"Если вы еще не знаете, что подарить любимой на Новый год, подарите ей предприятие "Аурум"!" — написала на своей странице в "Фэйсбуке" директор информационно-аналитического агентства "Бизнес-новости" **Ирина Юзвак.**

Алина ВЕТРОВА.

СКАНДАЛ

Тихон и Ятченко лишены медалей афинской Олимпиады-2004

Международный олимпийский комитет объявил сегодня о лишении медалей четырех призеров афинских Игр-2004 на основании положительных допинг-проб, которые выявлены в результате перепроверки анализов спустя 8 лет.

Среди наказанных и два белорусских атлета — **Иван Тихон**, ставший серебряным призером Афин-2004 в метании молота, а также бронзовая медалистка в метании диска **Ирина Ятченко**.

МОК также объявил названия запрещенных препаратов, которые были обнаружены в перепроверенных допинг-тестах спортсменов. У Ивана Тихона и Ирины Ятченко эксперты нашли метандиенон.

Всего на Олимпийских играх-2004 в Афинах у спортсменов было взято 3667 допинг-проб. Более сотни из них подверглись перепроверке в последние недели до истечения восьмилетнего срока хранения. И часть тестов дала положительный результат.

Ранее неофициально сообщалось, что ведется перепроверка допинг-проб за 2004—2005 годы и других именитых белорусских спортсменов — в том числе вице-чемпиона Олимпиады-2008 в метании молота Вадима Девятовского. В нынешнем году их анализы были исследованы с помощью новых технологий.

КУХНЯ ОТ КУТЮР

ЭНО вам надо?



*В Минске свое кулинарное искусство демонстрирует президент ассоциации итальянских шеф-поваров и обладатель двух звезд всемирного ресторанного гида "Мишлен" **Марко Сакко**.*

До 8 декабря в столичном ресторане высокой итальянской кухни "Фальконе" при поддержке Посольства Италии в Беларуси проходят Дни Пьемонта.

Тематикой первых Дней Пьемонта стала ***эногастрономия — искусство сочетания блюд и вина.*** Выбор объясняется тем, что этот регион Италии, граничащий с Францией и Швейцарией, известен в мире благодаря своей изысканной и оригинальной кухне, являющейся значимой частью культурного наследия Италии. Чтобы продемонстрировать последние мировые достижения в области эногастрономии, в Минск и приехал знаменитый итальянский шеф-повар Марко Сакко.

ЧЕМ УГОСТЯТ?

На презентации Дней Пьемонта журналистов потчевали традиционным пьемонтским вином, а также закусками.

Если пойдете на дегустации, попробуйте:

1. **Сыр кастельманьо** — один из самых редких и древних пьемонтских сыров, производится только в трех коммунах Пьемонта, а ежегодный объем производства составляет всего 50 тонн. В закуске подается с грушей и брезаолой (сыровяленой ветчиной из говядины, в которой всего 4% жира).

2. Стоит попробовать блюдо под названием **Bagna cauda** (или bagna caoda) — это ароматный теплый соус, который делают из анчоусов, чеснока, оливкового и сливочного масла. С ним подают жареные, вареные или просто сырые овощи.

3. Одним из наиболее известных специалитетов этой кухни являются **соленые анчоусы (килька) под зеленым соусом**, который готовится из чеснока, петрушки, яйца, анчоусов, оливкового масла, уксуса, острого перца и базилика.

4. **Трюфели**.

5. Пьемонт — мечта всех сладкоежек. Одной из самых известных местных сладостей являются **засахаренные каштаны**. Это лакомство очень дорогое, его часто преподносят в качестве подарка на Рождество.

На десерт в Пьемонте также принято подавать бонет (bonet) — традиционный пудинг из яиц, сахара, молока, ликера и миндального печенья.



Пьемонтское вино Бароло (Barolo) снискало славу "короля вин и вина королей".

И СКОЛЬКО СТОИТ ЭТО УДОВОЛЬСТВИЕ?

Имейте в виду: поход в "Фальконе" обойдется не дешево — это один из самых дорогих ресторанов столицы.

Вот лишь некоторые цены из повседневного ресторанного меню:

*Суп из морепродуктов, приготовленный в "Carta Fata", — **743.000**.*

*Домашняя паста "Тортелли дель Фарнезе" с шалфеем — **297 000.***

*Фламбе из тигровых креветок — **900. 000**.*

*Фламбе из телятины — **999. 000**.*

*Ассорти сыров "Фальконе" с мостардой и фруктовым хлебом **— 347 000.***

Однако, несмотря на нескромные цены, от недостатка клиентов заведение не страдает.

Falcone — единственный ресторан Беларуси, который внесен во всемирный справочник итальянских ресторанов, рекомендуемых Итальянской федерацией поваров.

В переводе с итальянского falcone означает "сокол".

КСТАТИ

Настоящие итальянские белорусы — дипломат и парикмахер

В рамках Дней Пьемонта впервые организована номинация L'Italiano vero — 2012 ("Настоящий итальянец"), которой хотели отметить людей, благодаря которым Беларусь и Италия стали ближе. В шорт-лист номинации вошли 10 "итальянских белорусов", о которых уже рассказывала "Народная Воля". Победителями стали бывший посол Беларуси в Италии (2002—2008 гг.) **Алексей Скрипко** и мастер парикмахерского искусства **Дарья Дубровина,** неоднократный триумфатор чемпионата мира по парикмахерскому искусству, проходящего в столице моды Милане.

Завершатся Дни Пьемонта гала-ужином в ресторане "Фальконе" ***8 декабря***, на котором лауреатам L'Italiano vero будут вручены дипломы, а Марко Сакко продемонстрирует все разнообразие так называемой эволюционной кухни.

Марина КОКТЫШ.

ВУНДЭРКІНДЫ

Школьнік з Талачына адкрыў уласны бізнес

Бацькам Вовы Андрыенкі, безумоўна, пашанцавала: яны могуць не даваць яму грошы на кішэнныя расходы. Іх сын з 14 гадоў зарабляе сабе сам.

Спачатку ён займаўся сеткавым маркетынгам, распаўсюджваў касметыку вядомай фірмы. Але праз паўтара года юнак вырашыў перайсці на больш сур'ёзны ўзровень. Разам з маскоўскім прадпрымальнікам ён пачаў праводзіць трэнінгі па інвестыцыях, фінансах, прыцягненні кліентаў, дапамагаў падняць продажы ў малым і сярэднім бізнесе.

— У мяне было пяць кліентаў, чатыры з Расіі і адзін з Беларусі, — распавядае малады прадпрымальнік. — *Я жыву ў Талачыне, і таму ўсе перамовы праходзілі праз электронную пошту і скайп, але гэта не перашкаджала працы і ніяк не адбілася на выніках. Мы выконвалі свае абяцанні: павялічвалі даходы і кліенцкія базы. Спачатку кліенты неадназначна рэагавалі на мой узрост (мне было 15 гадоў на той момант), але паступова сталі ўспрымаць сур'ёзна.*

Зараз Уладзімір распачаў праект па вырабе паштовак. Ён даўно займаецца пасткросінгам (сусветны рух па абмене паштоўкамі). Па яго словах, ідэя самім вырабляць паштоўкі прыйшла да яго, калі ён набываў паштоўкі на "Белпошце".

— *Я проста зразумеў, што ў нашага галоўнага паштовага аператара невялікі выбар,* — гаворыць хлопец. — *Я і два мае сябры, якія таксама займаюцца пасткросінгам, Віка Жлобіч і Ілля Конюшка, знайшлі карцінкі ў інтэрнэце, раздрукавалі іх у тыпаграфіі і запусцілі ў продаж. Але нашых уласных сродкаў не хапала для развіцця бізнесу, і таму ў маі 2012 года на Minsk Invest Weekend я расказаў аб нашым праекце Postcard of Dream. Ім зацікавіліся і ўклалі ў нас грошы.*



Гэта быў рызыкоўны крок. Па-першае, посткросінг — не вельмі распаўсюджанае ў Беларусі захапленне. Па-другое, людзі яшчэ баяцца заказваць праз інтэрнэт. Ну а па-трэцяе, існавала шмат тэхнічных праблем: неабходна было знайсці добрую тыпаграфію, дызайнераў, мастакоў.

Але ўсе праблемы былі вырашаны, і зараз Postcard of Dream — адна з самых буйных у Беларусі кампаній па вырабе паштовак. Вова, Віка і Ілля выйшлі на новы ўзровень: кіраўнікі Postcard of Dream арганізуюць майстар-класы па вырабе паштовак, яны ініцыятары святкавання народзін пасткросінгу 14 ліпеня. У планах запуск гукавых паштовак і інтэрнэт-крамы.

Адкуль у кіраўніка праекта хапае энергіі на падрыхтоўку да паступлення ў ВНУ і паспяховае вядзенне бізнесу?

— *Я і сам не ведаю, як я ўсё паспяваю!* — смяецца Вова. — *Тут шмат чаго залежыць ад планавання часу, але, шчыра кажучы, я вельмі шмат лянуюся. Каб не гэта, то вынікаў было б значна больш. Можа, яшчэ справа ў тым, што бацькі вельмі спакойна ставяцца да маіх бізнес-спраў і не сварацца, калі я не схадзіў у краму, бо разбіраўся з тыпаграфіяй.*

Пакуль што з бізнесу няма вялікіх дывідэндаў, усё заробленае аддаецца інвестару. Але са сваёй кансалтынгавай дзейнасці Вова набыў ноўтбук, тэлефон, фотаапарат і iPad.

Як прадпрымальніку-пачаткоўцу зацікавіць інвестараў? На гэта Уладзімір не дае дакладнага адказу.

— *Тут гаворка ідзе пра комплекс якасцяў,* — кажа ён. — *Па-першае, упэўненасць у сабе, гатоўнасць вучыцца, самаразвівацца. Па-другое, вы павінны быць развітымі як асоба. Па-трэцяе, важную ролю адыгрывае перспектыўнасць вашага праекта. Ну і апошняе, вы павінны верыць у свой поспех, без гэтага нічога не будзе. Але не трэба сядзець і чакаць, пакуль ваша ідэя ажыццявіцца, неабходна дзейнічаць. Толькі так можна дасягнуць поспеху.*

Ксенія ТАРАСЕВІЧ,
TUT.BY.

ПЕРАДСВЯТОЧНАЕ

100 тысяч за елку — гэта дорага ці не?

Паўтары сотні елачных кірмашоў адкрыецца ў Мінску 22 снежня. Кошт зялёнай прыгажуні будзе залежаць ад яе вышыні. Чыноўнікі ўжо зараз перасцерагаюць мінчан ад самавольнай высечкі дрэў.

"Елка ў гэтым годзе будзе каштаваць мінімум 20 тысяч рублёў, максімум — 100 тысяч", — цытуе словы чыноўнікаў onliner.by.

"Кантроль за высечкай елак будзе павышаны, — гаворыць першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама **Аляксей Раманаў**. — *Я ўпэўнены, што ніякай неабходнасці ехаць у лес і секчы самастойна гэтыя выдатныя дрэвы няма. Елі будуць даступныя. Яны будуць прадавацца ў месцах, максімальна набліжаных да жылых дамоў. Таму любы мінчук зможа набыць такое дрэва".*



ТЫМ ЧАСАМ

На навагоднія ўпрыгажэнні патрацяць амаль чвэрць мільёна долараў

*Навагодняе аздабленне абыдзецца Мінску ў суму не менш за 2 мільярды рублёў, або 234 тысячы долараў. Аб гэтым паведаміў намеснік дырэктара, галоўны мастак дзяржаўнага прадпрыемства "Мінскрэклама" **Аляксей Мартынаў**.*

"Лічба ўдакладняецца ў апошні момант, па факце выкананых работ, але мы разлічваем на 2 мільярды рублёў бюджэтных сродкаў", — прыводзіць словы Мартынава belta.by.

Дарэчы, усяго ў сталіцы ўсталююць 12 навагодніх ёлак.

Святочная навагодняя ілюмінацыя запрацуе ў Мінску з 15 снежня ў вячэрні час, калі стартуюць навагоднія мерапрыемствы. Святлодынамічныя расцяжкі будуць абсталяваны на вуліцах горада, плошчах, аўтамагістралях, гірляндамі ўпрыгожаць гарадскія елі і іншыя дрэвы.

У ТЭМУ

Карагоды пад міліцэйскім наглядам

У навагоднюю ноч патрапіць на ёлку ў Мінску можна будзе толькі пасля дагляду.

"Усе аб'екты правядзення масавых мерапрыемстваў будуць ачэплены, допуск на іх будзе ажыццяўляцца праз пэўны дагляд. Людзі з забароненымі прадметамі туды дапускацца не будуць", — цытуе БелаПАН начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама **Юрыя Сарокіна.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 СНЕЖНЯ 2012 г.

НАБОЛЕЛО!

Батареи холодные, как чиновничьи души...

Давно мы с женой — оба инвалида II группы — бьемся как рыба об лед в надежде, что достучимся до черствых душ местных чиновников. Но температура в жилье с наступлением холодов не превышает 12 градусов. Хорошо еще, что, когда в наш двухэтажный дом проводили "отопление" от котельной местного рыбхоза, мы не дали рушить ветхозаветные грубки, сооруженные строителями при возведении дома. Они-то нас и выручают. Но приходится покупать дрова по бешеной цене да еще платить и за пресловутое "отопление", которого нет.



Так мучаемся уже семь лет, просили и просим, чтобы помогли подключить квартирные батареи к газовой системе — труба проложена буквально возле дома, и у нас работает газовая плита. Так некоторые знакомые и сделали, но сколько им пришлось походить по инстанциям, раздобывая разные бумажки от ЖКХ, горгаза и так далее!

У меня же на такой "штурм" чиновников и чиновничков нет никаких сил и возможностей, особенно когда один посылает к другому, другой к третьему и никто не уделяет тебе никакого внимания. Обрадовался, услышав, что у нас в Любани будто бы есть спасительное "одно окно", где, дескать, если обращаешься со своей просьбой, сами собирают нужные справки-заявки и пускают их в ход вплоть до желанного результата... Если бы! Как оказалось, "окно"-то есть, да на пути к нему очень высокие пороги. Где нам, больным старикам, их преодолеть? Там ведь то же самое: раз твое дело — им и занимайся, ходи по инстанциям, если можешь.

И это при том, что я готов оплатить все расходы за подключение отопления к газовой трубе, хотя финансовые возможности у меня не совсем такие, как, к примеру, у нашего премьер-министра — обладателя каких-то несусветно дорогих часов. (Ума не приложу, зачем ему такие цацки, да еще напоказ?)

Ни в коем случае не претендую на место под солнцем и блага, положенные ответственным перед страной и народом руководителям. Но очень уж назойливо, настырно стараются они вдолбить в голову нам, простым людям, что прежде всего о нас только и заботятся да о том, чтобы повсюду торжествовала справедливость...

Я до самой пенсии работал в органах МВД — и рядовым милиционером, и участковым инспектором, и в службе охраны. Тогда мы с товарищами не считались со временем, не ждали (и не получали) доплат за сверхурочные переработки, тяжелые условия. В 52 года вынужден был уйти в отставку по болезни. Здоровье сгубил еще в пору военного лихолетья, когда, прячась от немцев, фактически жили с семьей в болоте. Отец погиб на фронте, так что и в мирное время натерпелись со всей семьей беды...

Думал во время службы: отдам все силы, чтобы людям было хорошо и спокойно жить. И чтоб была справедливость. Но где она? Где на деле забота государства о своих гражданах? Мы с женой, сильно тратясь на отопление, лекарства и все такое, едва рассчитываем скудные рубли на питание, не говоря уже о какой-то там роскоши. Откуда она, если пенсия у меня совсем не такая, как у сегодняшних силовиков? И нас, работников правоохранительных органов, государство поделило — на тех, что служили прежде, и тех, кто на посту теперь. У них и шкала при начислении пенсии другая, и всякие льготы.

Как живут сегодня былые дети войны, никого не волнует. 22 года я на пенсии, но за все это время никто из работников соцобеспечения ни разу не заглянул ко мне, не поинтересовался: как живется-можется, не промерзают ли старые кости, чем помочь? Все мои обращения в разные органы власти остались без ответа, в том числе и к "губернатору" Минской области Б.Батуре.

Видно, ледниковый период — один из вариантов конца света, предсказанного разными прорицателями, — уже на пороге домов забытых людей. Но прежде всего — в чиновничьих душах.

Евгений Антонович СЕМЕНЕНЯ, пенсионер.

г.Любань.

ОТ ДУШИ

Пусть хранит Вас Господь Бог!

Уважаемая "Народная Воля"!

С минувшей весны ты регулярно приходишь в наш дом. За это время мы успели подружиться с тобой. Ждем каждый очередной номер с большим нетерпением, читаем от корки до корки, а затем обсуждаем прочитанное. Подкупает стремление твоих журналистов донести до читателей правду нашей сегодняшней жизни, правду, которую в государственных СМИ не найти и днем с огнем.

С первыми же полученными номерами газеты познакомил одного из жителей нашей улицы. Сказал, что понравилась, пообещал оформить подписку со следующего месяца. Так и поступил. Более того, его примеру последовали еще несколько односельчан. Так что в твоем полку, "Народная Воля", прибыло! Я и на первый квартал следующего года продлил подписку. А мой друг из соседней деревни Жеретино подписался сразу на полугодие.

Вот и думаю: если бы каждый подписчик газеты приобщил к ее чтению хотя бы по одному человеку из числа родственников, друзей, знакомых, то тираж любимого издания удвоился бы, и ты могла бы выходить не два раза в неделю, а три.

Поскольку я человек сельский, то хочется, чтобы на твоих страницах чаще появлялись публикации о жизни в глубинке, сегодняшней деревне. Например, о ситуации на фермах, построенных несколько лет назад по одной в каждом районе. Про них сейчас никто и не вспоминает, наверное, на многих из них уже давно не играет музыка для буренок и надои от коров привычно "козьи". Похоже, наш большой "прорыв" скоро закончится! Да и про положение на промышленных предприятиях знать неплохо бы.

Всем журналистам газеты низкий поклон, новых интересных публикаций и, конечно же, здоровья и благополучия! Пусть хранит вас Господь Бог!

Иосиф НАЛИВАЙКО, житель д.Мазолово Мстиславского района.

ЧИТАТЕЛЬ—ЧИТАТЕЛЮ

Есть такое слово «поздно»

Прочитал в газете за 23.11.2012 г. письмо Ф.А.Мялика о бесчеловечности врачей во время лечения Н.В.Мялик. Искренне сочувствую Федору Афанасьевичу в связи с постигшим горем — утратой самого близкого человека.

Однако с утверждением о бездушности и непрофессионализме врачей я не могу согласиться.

Из письма видно, что за медицинской помощью Н.В.Мялик обратилась с большим опозданием, самостоятельно принимала лекарства, что усугубило болезнь. Время было упущено, и медицина оказалась бессильна. Врачи ведь не боги. Как указано в письме, лечение Н.В.Мялик проводилось: делались анализы, назначалась капельница, прошла операция, больная была подключена к аппаратам.

Я сам в апреле 2011 года тяжело заболел: были сильные боли в кишечнике, не мог принимать пищу, терял сознание и так далее. На следующий день обратился в лечебное учреждение. Проходил лечение в институте имени Александрова. Перенес четыре операции. Благодаря медицине мое здоровье нормализовалось. И, как сказали мне врачи, спасибо, что я своевременно обратился за медицинской помощью. В общем, не надо самим себя лечить. Надо доверять докторам.

Станислав Иосифович ТИХОНОВИЧ.

г.Столбцы.

ДЗЯКУЙ!

Наталяю душу прыгажосцю

Добры дзень, "Народная Воля"!

З захапленнем прачытала двойчы новыя вершы Генадзя Бураўкіна. Зберагу абавязкова гэты нумар "Народнай Волі", буду даваць чытаць людзям. Які яркі талент у слаўнага сына нашай шматпакутнай Бацькаўшчыны! Ён, лічу, адзін з самых лепшых у сузор'і сучасных паэтаў.



У мяне ёсць ранейшы зборнік Г.Бураўкіна пра каханне "Чытаю тайнапіс вачэй". Наталяю душу прыгажосцю пачуццяў і паэтычных вобразаў. Дзякуй, дарагі Генадзь Мікалаевіч, за Вашу цудоўную паэзію, за талент, розум, любоў да Беларусі, за Вашу сумленнасць. Дай Бог Вам моцнага здароўя, натхнення і новых кніг!

Прыязджайце да нас у Оршу на сустрэчу з прыхільнікамі Вашага таленту. У нас ужо былі слынныя Рыгор Барадулін, Леанід Дранько-Майсюк, Эдуард Акулін, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Арлоў, Уладзімір Някляеў і іншыя творцы. Сустрэчы адбываюцца ў Доме-музеі Уладзіміра Караткевіча. Яны выклікаюць цікавасць у землякоў. Мы будзем Вам вельмі рады!

Яўгенія КАЗЛОВА, чытачка "Народнай Волі" і мясцовая паэтка.

ПРАБЛЕМА!

Пакуль не рухнулі...



Старэе і памірае вёска. Вось гэтыя таполі таксама паміраюць стоячы. Даўно няма гаспадароў гэтай хаты, дзе на вуліцы Бобрыка дажываюць свой век і дрэвы. Помніцца мне, што "Народная Воля" змяшчала здымак і пісала, як рухнула дрэва на хату ў вёсцы Забараўцы на Піншчыне. Гэтыя старыя таполі, якія з'ядаюцца амялою, таксама вось-вось могуць рухнуць і нанесці ўрон не толькі хатам, што стаяць побач, але і людзям. Пакуль трагедыі не адбылося, зразумела, што іх трэба спілаваць.

З гэтай мэтай я звяртаўся ў раёнку, куды даслаў і пісьмо, і фотаздымак. Але пісьмо і фотка былі перапраўлены ў мясцовы ўладны кабінет. І наш чыноўнік проста адпісаўся. Паперу звялі, а дрэвы працягваюць пагражаць людзям.

Старыя, гнілыя дрэвы на вуліцах стаяць, затое ў цэнтральным скверы толькі за апошнюю вясну спілавалі з дзясятак яшчэ маладых і здаровых бяроз, клёнаў, елак. Мясцовы старшыня сельвыканкама спасылаўся на тое, што няма сродкаў, каб спілаваць гнілыя таполі. Але ж адкуль з'явіліся сродкі, каб у скверы высекчы дрэвы?..

Ну як і да каго дастукацца з гэтым простым пытаннем? Пакуль не позна.

Уладзімір ГУК, пенсіянер.

в.Бобрык Пінскага раёна.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Дзеля гонару нашай мовы

Возьмеш у рукі — вось гэта вага!
Колькі ж тут золата ў кожным слоўцы!..

Ніл Гілевіч. (Замест рэцэнзіі на Вялікі слоўнік беларускай мовы Ф.А.Піскунова. "Народная Воля", 22 чэрвеня 2012 г.)

Калі б мяне спыталі "Што самае важнае адбылося ў беларускай культуры сёлета?" я, не вагаючыся, адказаў бы: для мяне падзеяй нумар адзін стаў выхад з друку ***Вялікага слоўніка беларускай мовы.*** Ён сапраўды вялікі, найаб'ёмнейшы з тых, што калі-небудзь былі выдадзены на паперы. У яго ўключана 223 тысячы слоў сучаснай, жывой і афіцыйнай беларускай мовы. Дагэтуль слоўнікам з найбольшай колькасцю беларускіх загалоўных слоў быў апублікаваны Беларускай Савецкай Энцыклапедыяй у 1987 годзе Слоўнік беларускай мовы пад рэдакцыяй акадэміка **Мікалая Бірылы**, які змяшчаў крыху больш за 118 тысяч загалоўных слоў.

Слоўнік **Фёдара Піскунова** ўразіў не толькі сваім аб'ёмам, які быў дасягнуты ў выніку электроннай апрацоўкі больш як сямідзесяці мільёнаў (!) словаўжыванняў, зафіксаваных у прыкладна 2300 беларускамоўных пісьмовых крыніцах. Выклікае павагу грунтоўны падыход аўтара да той часткі слоўніка, якая ў падзагалоўку акрэслена як "парадыгматыка". Для абсалютнай большасці загалоўных слоў, уключаных у Вялікі слоўнік беларускай мовы, Фёдар Піскуноў распрацаваў арыгінальную сістэму адсылак да мадэльных узораў словазмянення. Інакш кажучы, той, хто будзе карыстацца гэтым слоўнікам, лёгка здолее праскланяць нават вельмі рэдкаўжывальны назоўнік ці праспрагаць нават той дзеяслоў, які не зафіксаваны ў грунтоўным Граматычным слоўніку дзеяслова, выдадзеным Нацыянальнай акадэміяй навук пяць гадоў таму.

Слоўнік Фёдара Піскунова — годны і, як кажуць, "сіметрычны" адказ тым асобам, якія займаюць нават найвышэйшыя дзяржаўныя пасады і сцвярджаюць, нібыта на свеце ёсць толькі дзве паўнавартасныя мовы — руская і англійская, а няшчасная беларуская ўсё пакутуе ад недахопу сродкаў самавыражэння. Гэта таксама адказ тым, у галовах каго неўміручай гідраю ажывае сіндром "малодшага брата". Хачу пры выпадку нагадаць, што самыя вялікія на сённяшні дзень выдадзеныя арфаграфічныя слоўнікі рускай мовы ўключаюць 180 тысяч (Акадэмічны слоўнік маскоўскага Інстытута рускай мовы) і 130 тысяч (слоўнік расійскага лінгвіста Мікалая Салаўёва) загалоўных слоў. У той самы час 17-томны Словарь русского языка, які выдаваўся Акадэміяй навук СССР на працягу 16 гадоў (1950—1965) меў 150 тысяч слоўнікавых артыкулаў.



Прозвішча аўтара-ўкладальніка новага капітальнага слоўніка вы (пакуль што) не знойдзеце ні ў адным айчынным мовазнаўчым даведніку. Таму знаёмцеся: Фёдар Антонавіч Піскуноў, у 1971 годзе скончыў хімфак БДУ, далей працаваў у тэхнічнай сферы: быў навуковым супрацоўнікам Інстытута электронікі НАН Беларусі, у 2008—2010 гадах — навуковым супрацоўнікам Фізічна-тэхнічнага інстытута НАН Беларусі.

Як?! — запытаецца нехта. — Чалавек без спецыяльнай філалагічнай адукацыі ўзяўся за складанне беларускага слоўніка? Ці варта давяраць такому слоўніку? Як філолаг, аўтар і сааўтар Арфаграфічнага слоўніка і некалькіх іншых беларускіх слоўнікаў, магу сказаць: безумоўна, варта!

Дарэчы, сёлета ў выдавецтве "Беларуская навука" з друку выйшаў Слоўнік беларускай мовы пад рэдакцыяй аднаго з аўтараў апошняй арфаграфічнай рэформы прафесара і доктара філалагічных навук **Аляксандра Лукашанца**. У гэтага даведніка, як гэта і належыць выданням падобнага кшталту, больш за дзясятак аўтараў-укладальнікаў, на яго выданне быў зроблены дзяржзаказ, атрымана, відаць, немалая датацыя з дзяржаўнага бюджэту. І ўсё-такі акадэмічны слоўнік шмат у чым прайграе слоўніку Фёдара Піскунова. Дастаткова сказаць, што акадэмічныя мовазнаўцы праігнаравалі ў сваёй працы словы, што даўно і трывала ўвайшлі ў асноўны лексічны фонд беларускай літаратурнай мовы: *Вялікдзень, дэмбель, напрыканцы, повязь, спадар, спадарства, суразмоўца, сярэднявечча, тамсама, хмарачос, хрушчоўка, шараговы* і шмат якія іншыя, якія, аднак, падаюцца ў аўтарскім Вялікім слоўніку беларускай мовы.

Вернемся, аднак, да капітальнай працы Фёдара Піскунова, якую яму дапамог рэалізаваць прыватны выдавец Зміцер Колас. Вядома, праца такога ахопу матэрыялу і проста "фізічнага" аб'ёму таксама не магла абысціся без паасобных недахопаў або спрэчных момантаў: з'явіліся рэцэнзіі, дзе гэтыя недахопы называюцца. Але гэта ні на ёту не ставіць пад сумнеў якасць і важнасць Вялікага слоўніка беларускай мовы, створанага перш за ўсё дзеля гонару нашай мовы. На жаль, наклад яго вельмі маленькі: дзяржаве з яе грандыёзнымі планамі засваення космасу і пабудовы лядовых палацаў сёння не да мовазнаўчых прац...

Лявон БАРШЧЭЎСКІ, кандыдат філалагічных навук.

С НАТУРЫ

Ночной диалог

...Иду в аптеку купить беруши (затычки для ушей). С вечера и до утра в соседних домах горланят, матерятся, так что деться некуда. Какая-то девушка у подъезда на всю Ивановскую просит-молит кого-то выбросить ей из окна сапоги: забыла бедная, уходя, обуться по пьяни! Ночь... Пацаны с какого-то этажа вступают с "жертвой" в громогласные переговоры, ничуть не заботясь, что беспокоят соседей.

— А ты с нами за бухло не расплатилась!

— Еще чего, вас много, а я одна...

— Да ни хрена с тобой и без сапог не будет.

Уж не знаю, застудила бедняжка себе ноги или нет, но что у нее и ее компании явно застужены мозги — факт. Подобные сценки чуть ли не возле каждого дома у нас далеко не редкость. А это почти что центр города, станция метро "Пушкинская".

В аптеке стоят "белджентльмены", покупают по пять флаконов боярышника. Лечатся... Однако поздно пить "Боржоми", когда почки почти отвалились. Что ж, можно ввести запрет на "чернила", можно поднять цену на сигареты хоть до ста тысяч за пачку. Но чернильно-табачной революции не будет. Смекалистые белорусы ящиками тащат одеколон, спешат на деревню к бабкам за самогонкой. Свинья, если захочет, всегда найдет лужу, чтобы поваляться.

Мы сами себя наказали, теперь спохватились. Эта мучительная мысль не дает покоя. Если верить умным людям, надежда умирает последней. Может, можно еще спастись, не опуская рук перед напастью?

Т.КАРЕЛИНА.

Минск.

РЕЗОНАНС

«Шашкой» по директору

Уважаемая редакция газеты "Народная Воля"!

Хочу высказаться по поводу статьи в №№185—186 от 27.11.2012 г., касающейся событий на "Ивацевичидреве".

Чувства, подобные тем, что выражены в "Народной Воле", посетили и меня после просмотра репортажа о посещении предприятия президентом. Все было понятно. Понятно то, каких усилий требует запланированная модернизация, особенно в современных условиях. Понятно было, сколько сил, времени, здоровья, нервов требовало это от директора. Результат впечатляющий. Мы смотрели новости всей семьей — люди разных поколений, в том числе современная молодежь, и у всех вырвался возглас: "Вот это да! Какое современное предприятие! И у нас!" Ну, а затем финал репортажа...

Приятно удивило то, что были робкие, хотя и безуспешные, попытки присутствующих защитить директора. Даже со стороны Семашко. Захотелось узнать, кто же директор, захотелось обратиться к коллективу (к кому же еще?) с просьбой-требованием защитить руководителя, которому действительно вместо спасибо нанесли такой удар. И вот через Вашу газету узнали, кто же директор. Я почему-то так и думала, что это крепкий, надежный человек, другой и не потянул бы эту модернизацию...

"Размахиванием шашкой" человеку, профессионалу и, несомненно, труженику, радеющему за дело, нанесен очень серьезный и тяжелый удар. Непорядки на старом предприятии — это в данной ситуации предмет для исправления. И почему это нельзя сделать при том же руководстве, которому прежде, может, и вздохнуть было некогда, не то что заглянуть лишний раз в подвалы и подсобку стареющих цехов. Мне кажется, нужна моральная реабилитация директора Михнюка. Ведь если положить на чашу весов то, что сделано, и то, что допущено (кстати говоря, за это отвечают конкретные люди на предприятии), то результат будет очевиден.

Считаю, что вашей газетой уже сделан шаг по разъяснению ситуации. Далее, на мой взгляд, должен сказать свое слово коллектив предприятия.

Людмила Михайловна КУЛЕШОВА.

Минск.

МНЕНИЕ

Страшнее кошки зверя нет?

С приходом холодного времени года коммунальщики — в очередной раз! — забивают окошки в подвалах жилых домов. Стараются вовсю, только бы не допустить туда бездомных, брошенных "добрыми" хозяевами кошек. А ведь иного спасения от непогоды, мороза у них нет.

Но почему-то никто не думает, что с исчезновением в подвалах кошек, там неизбежно будут плодиться мыши и крысы. От них же, вездесущих разносчиков заразы, нет никакого спаса, несмотря на всякую отраву. Известны случаи, когда грызуны по трубам добирались из подвалов до верхних этажей высотных зданий...

Зоозащитники, знаю, не раз обращались к городским властям, пытаясь убедить в недопустимости применяемых ими мер. Но, увы, результата не было и нет. Вот и получается: и те, кто отдает жестокие приказы, и те, кто их исполняет, наносят урон не только животным, но и людям, в том числе и своей душе...

Розалия РУБИНЧИК, минчанка.



КОРОТКО

Самые влиятельные люди в мире

Журнал “Форбс” составил очередной список наиболее влиятельных людей в мире, куда вошли политики, бизнесмены, крупные руководители и филантропы. По единодушному выбору составителей, его во второй раз возглавил президент США Барак Обама. Российский лидер Владимир Путин за прошедший год переместился на одну строчку вниз, уступив второе место канцлеру Германии Ангеле Меркель.

О чем шептались Путин с Януковичем?

Как свидетельствуют СМИ, после заседания в узком составе делегация лидеров СНГ стала перемещаться в зал, где начиналось расширенное заседание. Их строй замыкали президенты России и Украины, причем последний, “отчаянно жестикулируя, что-то доказывал Владимиру Путину”. Через пару минут к двум “отколовшимся” от общей группы лидерам присоединился президент Казахстана Назарбаев, и разговор принял “еще более оживленный и даже ожесточенный характер”. Это продолжалось “минут шесть-семь, и все остальные лидеры СНГ так и стояли в ожидании трех коллег у входа в зал”. Наконец хозяин саммита, президент Туркмении, подошел к увлекшейся тройке и показал на остальных коллег, после чего общее мероприятие наконец продолжилось.

По словам украинских переговорщиков, Янукович поделился с ними тем, что обсуждал с российским коллегой проблему газового транзита. Речь шла о транзите туркменского газа через Казахстан и Россию в Украину.

Столкновения в Каире привели к жертвам и сотням раненых

Появились жертвы ожесточенных столкновений в египетской столице. Согласно данным службы скорой помощи АРЕ, ранены сотни человек.

На центральной каирской площади Тахрир, где уже около двух недель остаются противники президента Мухаммеда Мурси, слышна стрельба. Египетские силовики называют происходящее в столице “гражданской войной”.

В столице Швеции в четверг началась неделя Нобелевских торжеств

Стокгольм будет чествовать девять лауреатов самой известной в мире научной премии, которая будет вручена 10 декабря в столичной филармонии. Всего в этом году высокую награду получат десять лауреатов, но, согласно завещанию Альфреда Нобеля, Нобелевская премия мира вручается в Осло. В этом году ее удостоен Евросоюз. Самым пожилым обладателем Нобелевской премии этого года будет 89-летний американский экономист Ллойд Шэпли. Самый молодой из обладателей высокого звания в этом году — 50-летний японский ученый Синья Яманака, получивший премию по медицине.

Если в 2011 году сумма Нобелевской премии составила 10 миллионов крон (1,5 миллиона долларов), то в этом году она уменьшилась до 8 миллионов крон (1,2 миллиона долларов). Минувшим летом Нобелевский фонд объявил, что впервые за 60 лет размер премии “будет сокращен по причине неблагоприятных времен”.

Венгрия эвакуировала своих дипломатов из Дамаска

Правительство Венгрии объявило о полной эвакуации персонала своего посольства из Дамаска, сообщает Reuters. Как объяснили в МИД этой страны, такое решение было принято в связи с “критической ситуацией” в сирийской столице.

До последнего времени Венгрия оставалась единственной страной Евросоюза, чье посольство все еще работало в сирийской столице. Прочие страны ЕС вывели свои диппредставительства оттуда месяцы назад.

Ранее решение эвакуировать технический персонал из Сирии приняло местное представительство ООН. Этот шаг также объяснялся соображениями безопасности. В последние недели ситуация в Дамаске и вокруг него существенно обострилась: повстанцы почти ежедневно проводят боевые операции в столице, и правительственные силы с трудом контролируют центр города.

К РАЗМЫШЛЕНИЮ

Почему Лондон перестал считаться мировым финансовым центром?

Кризис отнял у Лондона титул главного финансового центра мира. К концу этого года финансовой столицей станет Нью-Йорк. Лондон через три года опустится еще ниже — на третье место, его оттеснит Гонконг, а возможно, и Сингапур, считают специалисты из Centre for Economics and Business Research (CEBR).

Лондон теряет свое лидирующее положение из-за общего сдвига в мире финансов на восток, а также из-за недальновидной политики британского правительства, особенно в части налогообложения и многочисленных бюрократических препятствий, мешающих эффективно работать финансистам на Темзе.

Повышая налоги, правительство Великобритании добьется противоположного результата. Финансисты уезжают работать туда, где налоги ниже. В результате снижения активности в Сити Британия уже в самом ближайшем будущем начнет терять по 30—40 миллиардов фунтов стерлингов в год на налогах по сравнению с пиком, пришедшимся на 2007 год.

ТАМ, У БАЛГАРЫІ

...Каб зачапіцца за Еўропу

Некалькі дзён таму я пабывала ў адной з самых прэстыжных вышэйшых навучальных устаноў Балканаў — сафійскім Універсітэце Святога Клімента Ахрыдскага. І даведалася, што Балгарыя з радасцю прыме беларускіх студэнтаў. Ім нават дапамогуць “сплыць за бугор” за разумнае ўзнагароджанне...

Знаёмыя незнаёмцы

Балгарыя — турыстычны цэнтр Усходняй Еўропы, гэта яшчэ за савецкім часам ведаў і стары, і малы беларус. Амаль кожны марыў патрапіць у ідэалагічна ўхвалены сонечны рай. Але сёння маладых людзей з постсавецкай прасторы вабяць не пляжы Залатых пяскоў ці водар Даліны руж. Для юных расіян, украінцаў і беларусаў балгарскія вышэйшыя навучальныя ўстановы — магчымасць раз і назаўжды зачапіцца ў Еўропе.

У вачах многіх Балгарыя дагэтуль тая ж “нептица—незаграница”, што і Польшча. Між тым балгарскія ўніверсітэты пасля падпісання дакумента “Еразм Хартыя — 2007” сталі паўнавартаснымі сябрамі ў Еўрапейскім саюзе ўніверсітэтаў, а значыць, кожны студэнт тут мае такія ж правы, што і любы еўрапеец.

“Я вучуся ва Універсітэце Св.Клімента Ахрыдскага на факультэце журналістыкі і масавых камунікацый, — распавяла 22-гадовая расіянка **Ганна Красько**. — *Выбарам краіны навучан-*



ня вельмі задаволена. Тут цудоўныя выкладчыкі і сяброўская атмасфера. У Расію вяртацца не хачу. Думаю, я змагу знайсці сабе працу тут — у Балгарыі шмат перспектыў. Калі не — паеду далей у Еўропу”.

Сталіца Балгарыі Сафія заўжды была сапраўдным цэнтрам акадэмічнага жыцця краіны. Менавіта тут знаходзяцца многія буйныя навучальныя ўстановы, у тым ліку і знакаміты Універсітэт Св.Клімента Ахрыдскага. Тое, што замежнікаў тут чакаюць, заўважна адразу. Напрыклад, у інфармацыйным цэнтры ўніверсітэта “Народнай Волі” прапанавалі мноства каляровых буклетаў на рускай мове, у якіх падрабязна распісаны ўсе прапановы, выгоды і перспектывы навучання. Студэнтаў тут чакаюць, бо разам з імі прыязджаюць грошы.

Стаўкі растуць

Сёння заахвочванне замежных студэнтаў да вучобы ў Балгарыі — развіты і паспяховы бізнес. Кампанія “Еўрадыплом”, напрыклад, мае свае прадстаўніцтвы ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіраве, Рызе і Бургасе. Кансультанты гэтай фірмы дапамогуць абітурыенту прайсці ўвесь шлях традыцыйных сумненняў — ад выбару прафесіі да пошукаў інтэрнату.

“Народная Воля” звярнулася ў балгарскае прадстаўніцтва фірмы — цікава, колькі каштуе паслуга і ці сапраўды такая ўжо вялікая ад агентаў карысць? Высветлілася, што поўны цыкл падтрымкі “Еўрадыплома” каштуе 900 еўра. Не так шмат, калі ўлічыць, што сюды ўваходзяць і візавыя клопаты, і ўладжванне пытанняў наконт віду на жыхарства.

“Грамадзянства беларускае? — удакладніла паненка. — *Часцей да нас расіяне і ўкраінцы звяртаюцца, але ніякіх перашкод быць не павінна. Толькі вам прыйдзецца прыехаць у любы зручны для вас офіс, дзе мы складзем дамову”.*

Вось і ўсё — запаўняеш на сайце анкету і выпраўляешся ў офіс. Далей — справа тэхнікі. Уступных экзаменаў у балгарскіх ВНУ, як і ў астатняй Еўропе, няма. Тут галоўнае — сабраць усе неабходныя паперкі. Ну і не вылецець пасля першай сесіі.

Што тычыцца моўнага пытання, то і яго ў Балгарыі хутка вырашаюць. Той жа сафійскі ўніверсітэт забяспечвае замежным студэнтам папярэднюю падрыхтоўку па мовах і спецыялізаваную падрыхтоўку на факультэт славянскай філалогіі. Навучанне працягваецца не менш за 9 месяцаў. У групах — не больш за 10 чалавек.

Гучыць неверагодна, але жыхары краіны віталі падвышэнне коштаў на навучанне для замежнікаў! Дадатковыя грошы дазволілі ўзбагаціць праграмы ВНУ, адкрыць новыя актуальныя спецыяльнасці. Сёння замежны студэнт аддае за навучанне ў ВНУ Балгарыі амаль як у Мінску — ад 1200 да 1600 еўра. Вось толькі беларусы бяруць столькі са сваіх...

Такія кошты прываблiваюць моладзь. У буйнейшым сафійскім універсітэце “Народнай Волі” паведамілі, што ступень бакалаўра атрымліваюць 1600 замежнікаў з 55 краін.

Вучыліся бясплатна? Вярніце веды!

Запрашаючы ў краіну інтэрнацыянальных студэнтаў, балгары не толькі дбаюць аб дабрабыце сваіх універсітэтаў. Маладыя і актыўныя замежнікі не супраць застацца ў краіне і пасля заканчэння навучання. А вось частка мясцовых выпускнікоў на радзіме затрымлівацца не надта жадае. Кошты навучання для іх невысокія — ад 80 да 800 леваў за семестр (ад 40 да 400 еўра), але і заробкі ўчарашніх студэнтаў не шыкоўныя. Згодна з дадзенымі балгарскага Мінстата, сярэдні заробак у краіне за 2012 год склаў 700 леваў (ці 350 еўра). Пры еўрапейскіх коштах на энергарэсурсы гэтыя грошы падаюцца мізэрнымі. Адкрытыя межы вабяць туды, дзе, падаецца, і трава зелянейшая, і заробкі — у еўра.


Год таму прэм’ер-міністр Балгарыі **Бойка Барысава** не вытрымала і з трыбуны звярнулася да сумлення грамадзян. Атрымалі адукацыю — вярніце свае веды, папрацуйце на радзіме. Свае словы чыноўніца





адрасавала перш за ўсё моладзі. Спадарыня Барысава адкрытым тэкстам заявіла — нядблага было б вярнуцца да традыцыі размеркавання.

Сапраўды, кожны год самая прэстыжная ВНУ Балгарыі — Універсітэт Святога Клімента Ахрыдскага выпускае каля трох тысяч маладых спецыялістаў. І кожны год частка свежых кадраў з’язджае з краіны ў пошуках лепшай долі. З аднаго боку, ёсць неаспрэчная нагода для радасці — дыпломы балгарскіх ВНУ цэняцца на рынку працы “вялікай Еўропы”. З іншага — мазгі сплываюць.



